Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

Б Е Л А Р У С К А Я Г А З Е Т А

30 ЖНІЎНЯ 2007 г.
ЧАЦВЕР
№ 162 (26027)
Кошт 380 рублёў
ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 Г.

Надвор'е

Месцамі ўначы магчымы невялікія замаразкі

У апошнія дні лета і ў пачатку верасня на тэрыторыю Беларусі будзе працягваць аказваць уплыў халодная паветраная маса з боку Скандынаўскага паўвострава, — паведаміў рэдакцыі начальнік службы гідраметэаралагічных прагнозаў Рэспубліканскага гідраметцэнтра Дзмітрый Рабаў.

У сувязі з гэтым сёння месцамі, а 31 жніўня амаль паўсюль па краіне пройдуць кароткачасовыя дажджы — галоўным чынам удзень.

Асабліва халаднавата будзе ўначы 30 і 31 жніўня, калі тэмпература паветра знізіцца да 3—9 градусаў, а на тарфяніках Палесся на глебе чакаюцца слабыя замаразкі да 0 — мінус 1 градуса. Тэмпература паветра ўдзень з пятніцы да нядзелі ўключна — ад 13 градусаў па поўначы да 20 па поўдні краіны. Згодна з папярэднімі прагнозамі, халоднае надвор'е з кароткачасовымі дажджамі чакаецца і на наступным тыдні. Разам з тым павышаная воблачнасць і вільготнасць павысяць тэмпературу паветра ўначы да 7—12 градусаў. Удзень чакаецца 14—20 градусаў. У асобныя дні па поўдні краіны тэмпература паветра ўдзень можа павысіцца на 2—3 градусы.

Сяргей КУРКАЧ.

А на мой погляд...

СПАЖЫВАЕМ СВАЁ, ЭКАНОМІМ — АГУЛЬНАЕ

Разумны чалавек заўсёды лічыць грошы: і свае, і грамадскія. Калі можна зэканоміць, навошта ўпускаць такую магчымасць? Таму большасць з нас ужо даўно імкнецца зводзіць спажыванне тых жа энергарэсурсаў да разумных, цалкам апраўданых памераў. Тым больш што тэма эканоміі апошнім часам была ўзнята на самы высокі ўзровень, паколькі менавіта скаардынаваныя намаганні ў гэтым накірунку могуць прынесці максімальны эфект. Але, як ужо гаварылася, любая справа пачынаецца персанальна і асабіста з кожнага з нас. Шляхоў эканоміі энергарэсурсаў можа быць мноства: ад укаранення энергазберагальных тэхналогій і набыцця складанай бытавой тэхнікі з мінімальным узроўнем энергаспажывання да ўстаноўкі лічыльнікаў і элементарнай эканоміі.

А якія асабіста ў вас «рэцэпты» эканоміі энергарэсурсаў?

Рыгор КАСІЧЭНКА, начальнік эканамічнага ўпраўлення Міністэрства спорту і турызму:

— Мы паставілі ў жыллі імпартныя энергазберагальныя лямпачкі. Гэта ўжо пэўная эканомія энергарэсурсаў. Пліта на кухні ў нас электрычная, таму карыстаемся ёй толькі ў выпадку сапраўднай неабходнасці. Зразумела, прытрымліваемся агульнапрынятых прынцыпаў эканоміі не толькі электрычнасці, але і вады, цяпла. Паколькі мы адносна нядаўна пераехалі ў новы дом, складаная бытавая тэхніка — новая і сучасная, таксама дазваляе эканоміць энергарэсурсы ў параўнанні з папярэднімі мадэлямі.

Наталля ЖЫВАЛЁЎСКАЯ, старшы інспектар Цэнтра прапаганды і навучання пры ўстанове «Гродзенскае абласное ўпраўленне МНС»:

— Нават тэлевізар, які пакінулі ў рэжыме чакання (гарыць чырвоная лямпачка), спажывае за суткі пэўную колькасць электраэнергіі. Больш таго, цалкам не абясточаны прыбор уяўляе сабой няхай і мізэрную, але небяспеку. Як толькі перагарыць звычайная лямпачка напальвання, тут жа імкнуся замяніць яе імпартнай энергазберагальнай. Яны, праўда, каштуюць у 4—5 разоў больш за звыклыя, але і перагараюць не так часта — ужо эканомія. Ежу мы гатуем на газавай пліце, а вось разаграваць імкнёмся ў СВЧ-печы. Працэс хуткі, і зноў жа нейкая эканомія. Калі даводзіцца набываць складаную бытавую тэхніку, заўсёды гляджу на магутнасць прыбора. Паколькі кватэра ў нас старой забудовы і вуглавая, на зіму заўсёды ўцяпляем вокны.

Валянцін ШАТРАЎКА, начальнік аддзела ўліку лясного фонду і арганізацыі лесакарыстання Міністэрства лясной гаспадаркі:

— Калі гаварыць асабіста пра маю сям'ю, найперш скажу пра лічыльнікі вады. Грошы яны дапамагаюць эканоміць істотна, гэта дакладна гавару. У кватэры ў нас устаноўлены энергазберагальныя лямпачкі, больш таго, усе люстры — з раздзельным уключэннем лямпачак, што дазваляе, па-першае, рэгуляваць яркасць святла, па-другое, эканоміць. Ваду нагрэць хутчэй і эканомней не на электраплліце, а ў электрачайніку. Балкон у нас цалкам зашклёны, у аконных праёмах — першыя айчынныя драўляныя шклопакеты. Гэта ўжо пра эканомію цяпла. Калі ж сказаць колькі слоў пра міністэрства, дык мы вельмі актыўна працуем над пытаннямі выкарыстання мясцовых відаў паліва. У прыватнасці, стварэння плантацый хуткарослых парод драўніны (таполі, асіны, вярбы) найперш там, дзе ёсць міні-цэц, што працуюць на дровах, і прыцягнення ў якасці паліва малакаштоўных парод драўніны кшталту шэрай вольхі.

Віталь КУШНЯРОЎ, галоўны інжынер — галоўны дыспетчар аператыўна-дыспетчарскага ўпраўлення энергасістэмай Рэспублікі Беларусь:

— Калі гаварыць пра электразберажэнне, трэба памятаць, што найбольш электрычнасці спажываюць электраплліты, за імі ідуць пральныя машыны-аўтаматы. З апошнімі нічога не зробіш, бо там закладзены пэўныя праграмы. А вось плiты, асабліва з масіўнымі тэнамі, маюць найменшы КПД, таму ваду для гарбаты, напрыклад, лепш грэць у электрачайніку з унутранай спіраллю. Будзе істотная эканомія, бо вада разаграецца знутры, у той час як чайнік на пліце больш абаграе памяшканне. Тое самае можна сказаць і пра эканамічнасць СВЧ-печаў: у іх таксама ежа разаграецца знутры, што вядзе да эканоміі. Наступны прыбор — прас. Галоўнае, не пакідаць яго без лішняй патрэбы ўключаным. Што датычыць асвятлення, дык лямпачкі напальвання да 90 працэнтаў светлавога патоку расходуюць на абагрэў. Іх пажадана замяніць на энергазберагальныя, але толькі ў тых месцах, дзе святлом карыстаюцца даволі часта. Увогуле такія лямпачкі спажываюць у 4—5 разоў менш электраэнергіі, чым звычайныя напальвання, хаця і каштуюць даражэй.

Што да цеплаэнергіі, то тут, на жаль, уладальнік кватэры пакуль пазбаўлены магчымасці самастойна рэгуляваць яе расходаванне. Хаця ў новых сучасных дамах ужо прадугледжваецца такая рэгуліроўка. Таму галоўныя шляхі эканоміі: уцяпленне (ці замена) вокнаў, уваходных дзвярэй і абавязкова — зашкленне лоджыі ці балкона. Шчыльныя шторы, якія не закрываюць батарэі (як і дэкаратыўныя радыятары), могуць павысіць тэмпературу ў памяшканні на 2—3 градусы.

Сяргей СТАРЫНАЎ.

РАСТУЩЬ «ЗОРКІ» на праспекце «Звязды»

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

г. Мінск.

Рэнтабельнасць нафтаперапрацоўчых заводаў сёлета — каля 5 працэнтаў, —

заяўляюць у канцэрне «Белнафтахім»

Рэнтабельнасць нафтаперапрацоўчых заводаў Беларусі ў першым паўгоддзі склала каля 5 працэнтаў. Аб гэтым паведаміў журналістам намеснік старшыні Беларускага дзяржаўнага канцэрна па нафце і хіміі («Белнафтахім») Уладзімір ВОЛКАЎ.

Узровень рэнтабельнасці сёлета значна меншы, чым летась (з-за змены ўмоў пастаўкі расійскай нафты на НПЗ). У той жа час «Белнафтахім», паводле слоў намесніка старшыні канцэрна, не збіраецца згортваць інвестыцыйныя праекты па мадэрнізацыі прадпрыемстваў. Акрамя сваіх, плануецца выкарыстоўваць і крэдытныя сродкі.

Прыярытэтам у мадэрнізацыі НПЗ будзе, у прыватнасці, павышэнне глыбіні перапрацоўкі нафты. Сёння яна складае 70—75 працэнтаў. Пасля мадэрнізацыі павінна скласці 92 працэнты.

Уладзімір Волкаў паведаміў, што зараз пачынаюцца перамовы беларускага боку з Расіяй аб пастаўках нафты ў 2008 годзе. Плануецца, што налета ў краіну будзе пастаўлена 21,5—22 млн тон нафты. Пры гэтым намеснік старшыні канцэрна нагадаў, што з нядаўняга часу Беларусь атрымлівае нафту па цане, якая ўтвараецца па формуле, што «ўлічвае хістанне цаны на сусветных рынках. Рэалізацыя нафтапрадуктаў таксама ажыццяўляецца ў асноўным па формуле».

Намеснік старшыні канцэрна дадаў таксама, што прыбытак НПЗ Беларусі налета будзе залежаць не ад кошту нафты, пастаўляемай з Расіі, а ад розніцы паміж цаной нафты і цаной нафтапрадуктаў. «Цана нафты можа быць нізкай, але цана нафтапрадуктаў таксама нізкая. І вынік не такі добры, як хацелася б. Аднак часам пры высокім узроўні цаны нафты высокім з'яўляецца кошт нафтапрадуктаў. І затраты на нафту акупляюцца пасля рэалізацыі нафтапрадуктаў».

Гаворачы пра рэалізацыю праектаў па здабычы нафты за мяжой, Уладзімір Волкаў адзначыў, што яны «знаходзяцца ў стадыі абмеркавання, у стадыі выпрацоўкі канкрэтных рашэнняў па дасягненню станоўчых вынікаў ад гэтай дзейнасці». Што датычыць здабычы нафты ўнутры Беларусі, то ў апошнія гады назіраецца невялікае «планамернае зніжэнне здабычы». Адбываецца гэта з-за выпрацоўкі запасаў, росту абводненасці нафты і г.д. За 7 месяцаў сёлета ў краіне было здабыта крыху больш за 1 млн тон нафты.

Каментуючы сітуацыю са спыненнем пэўны час таму транзіту расійскай нафты (пастаўкі нафты былі спынены Расіяй) па магістральных нафтаправодах у накірунку Вентспілса, Буцінге і Мажэйкяйскага НПЗ, намеснік старшыні канцэрна адзначыў, што беларускі бок зацікаўлены ў аднаўленні паставак. «Мы гатовы да аднаўлення пракачкі. Мы падтрымліваем нашы нафтаправоды ў тэхнічна спраўным стане... Але маршрутызацыю нафты ажыццяўляе расійскі бок».

Сяргей КУЗНЯЦОЎ.

НЕ Ў ЛІЦЭНЗІІ СПРАВА

У Брэсцкай вобласці пракуратура адмяніла дзве незаконна ўзбуджаныя справы ў адносінах да кіраўнікоў сельгаспрадпрыемстваў. Аб гэтым паведаміў журналістам намеснік генпракурора Мікалай Купрыянаў перад пачаткам калегіі Генпракуратуры.

Праведзеная праверка паказала, што ёсць шэраг незаконна ўзбуджаных спраў, у якіх фігуруюць кіраўнікі прадпрыемстваў АПК. У прыватнасці, яны абвінавачваюцца ў незаконнай бязліцэнзійнай прадпрымальніцкай дзейнасці і гандлі. На самай жа справе перавозка грузаў ажыццяўлялася з мэтай аказання дапамогі суседнім прадпрыемствам, а рознічны гандаль — у продажы сельгаспрадукцыі па яе сабекошту працаўнікам сяла. Як адзначыў Мікалай Купрыянаў, з'явіліся і новыя звароты кіраўнікоў АПК са скаргамі.

Генадзь ХУДЗІНСКІ, БЕЛТА.

У ГОМЕЛЬСКАЙ ВОБЛАСЦІ 76 СУБ'ЕКТАЎ ГАСПАДАРАННЯ ВЫПЛАЧВАЛІ ЗАРПЛАТУ Ў «КАНВЕРЦЕ»

У Гомельскай вобласці выяўлены 76 арганізацый і індывідуальных прадпрымальнікаў, якія выплачвалі зарплату ў «канверце» наёмным работнікам. Такія вынікі праверак, праведзеных у першым паўгоддзі гэтага года Гомельскай абласной інспекцыяй Міністэрства па падатках і зборах Беларусі.

Як паведамілі ў абласной інспекцыі, падчас праверачных рэйдаў супрацоўнікі падатковых органаў выявілі 76 суб'ектаў гаспадарання, якія выдалі 188 наёмным работнікам зарплату без адлюстравання яе ў бухгалтарскай справаздачнасці і ўтрымання падаходнага падатку. Пры гэтым трэць з іх атрымлівала заробак ніжэй за ўстаноўлены дзяржавай мінімальны памер. Па выніках праверак у бюджэт спагнана Br21,1 млн падаткаў і эканамічных санкцый. Пры гэтым да адміністрацыйнай адказнасці прыцягнуты 74 суб'екты гаспадарання, якія аштрафаваны за парушэнне заканадаўства на Br2,8 млн. **У абласной інспекцыі дадалі, што паведаміць аб падобных фактах грамадзяне могуць па тэлефону «даверу» ў Гомелі: 74-38-06.**

Алена САФРОНАВА, БЕЛТА.

ПАЛЮЕМ НА ЛАСЯ І АЛЕНЯ

З 1 верасня ў краіне, згодна з Правіламі вядзення паляўнічай гаспадаркі і палявання, пачнецца трафейнае і селекцыйнае паляванне на лася і высакароднага аленя.

Паляваць будзе дазволена на дарослых самцоў старэй двух гадоў на працягу сутак ружэйным способам — з засады, з падыходу, з падманьваннем. Гэты восеньскі сезон будзе доўжыцца да 30 верасня. Да гэтай жа даты будзе дазволена, дарэчы, і здабыча дзіка на патравах сельскагаспадарчых культур.

Сяргей РАСОЛЬКА.

Здарэнне

ЛОСЬ ТРАПІЎ ПАД МАШЫНУ. ПАЦЯРПЕЛА ДЗІЦЯ

У Брэсцкім раёне недалёка ад пасёлка Мухавец на дарогу раптоўна выскачыў лось. Аварыя адбылася а палове дзесятай вечара. Вадзіцель легкавой машыны «Мерседэс» не паспеў адрэагаваць. У выніку сутыкнення закрытую чэрапна-мазгавую траўму атрымала 10-гадовая дачка вадзіцеля. Сам 44-гадовы брастаўчанін і яго жонка не пацярпелі. Параненага ж віноўніка ДТЗ перадалі ў мясцовую паляўнічую гаспадарку.

Яна СВЕТАВА.

АЛЯКСАНДР ЛУКАШЭНКА ЎЗНАГАРОДЗІЎ ШМАТДЗЕТНЫХ ЖАНЧЫН БЕЛАРУСІ ОРДЭНАМ МАЦІ

За нараджэнне і выхаванне пяці і больш дзяцей Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка ўзнагародзіў шматдзетных жанчын краіны ордэнам Маці.

У ліку тых, хто ўдастоены гэтай узнагароды, — сацыяльны работнік Ляхавіцкага раённага тэрытарыяльнага цэнтра сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва Вольга Горбік, хатняя гаспадыня вёскі Альшаны Столінскага раёна Таццяна Кірыловіч, палявод прыватнага гандлёва-вытворчага ўнітарнага прадпрыемства «АграЭлітаПрадукт» Баранавіцкага раёна Надзея Саўчук, аператар сувязі Астравецкага раённага вузла паштовай сувязі Лілія Кіткевіч, прадавец ГД «На Нямізе» Вера Заяц.

Адпаведны ўказ кіраўнік дзяржавы падпісаў 28 жніўня.

АЛЯКСАНДР ЛУКАШЭНКА ПАВІНШАВАЎ АБДУЛАХА ГЮЛЯ З ВЫБРАННЕМ ПРЭЗІДЭНТАМ ТУРЦЫІ

Кіраўнік беларускай дзяржавы Аляксандр Лукашэнка павіншаваў Абдулаха Гюля з выбраннем прэзідэнтам Турэцкай Рэспублікі.

Аляксандр Лукашэнка выказаў надзею на далейшае развіццё беларуска-турэцкіх узаемавыгадных адносінаў.

Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

РОЗГАЛАС

АПОШНЯЯ ІНФАРМАЦЫЯ СУТАК

МАЛАКО АД НАСЕЛЬНІЦТВА — ПА 400 РУБЛЁЎ ЗА ЛІТР

Як ужо паведамляла ўчора «Звязда», у сувязі з істотным падаражаннем матэрыяльна-тэхнічных рэсурсаў для сельскагаспадарчых прадпрыемстваў урадам краіны прынята рашэнне аб павелічэнні з 1 верасня на 5 працэнтаў закупачных цэн на малако.

Паводле ўдакладненай інфармацыі, якую рэдакцыя атрымала ў Міністэрстве сельскай гаспадаркі і харчавання, з пачатку першага месяца восені закупачныя цэны на малако складуць: за літр вышэйшага гатунку — 435 рублёў, першага гатунку — 400 рублёў, другога гатунку — 250 рублёў. Негатунковае малако будзе закупляцца па ранейшых цэнах — 140 рублёў за літр. Што датычыць асобна насельніцтва, дык ад яго закупкі малака рэкамендавана весці па цэнах першага гатунку — 400 рублёў за літр.

Сяргей РАСОЛЬКА.

БУЛЬБУ ЎЖО КАПАЮЦЬ. ЦАНА ЯШЧЭ НЕ ВЫЗНАЧАНА

У грамадскім сектары краіны распачалася масавая ўборка бульбы: «другі хлеб» ужо выбралі з 500 гектараў. Ураджайнасць пры гэтым складае 180 цэнтнераў з гектара. Да ўборкі бульбы прыступілі і ў прыватным сектары.

Ураджайнасць і якасць клубняў намеснік генеральнага дырэктара па навуцы РУП «Інстытут бульбаводства Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі» Іван Калядка ацэньвае як добрыя. Прынамсі, умовы надвор'я апошняга часу, на шчасце, свайго адмоўнага ўплыву на бульбу не аказалі. «Есць, канешне, асобныя ўчасткі, дзе з-за перазвышчынення глебы назіраюцца прыкметы ўдушша бульбы, але ў цэлым сітуацыя добрая». Разам з тым Іван Іванавіч параіў у тым ліку і вяскоўцам напачатку на пэўны час закладваць бульбу на часовае захоўванне з мэтай выяўлення магчымых хваробаў. Што датычыць мяркуемых закупачных цэн на «другі хлеб», то, як адказалі ў Міністэрстве сельскай гаспадаркі і харчавання, на сённяшні дзень тут прытрымліваюцца пазіцыі: яны павінны быць свабоднымі дагаворнымі. Нагадаем, у пэўныя гады міністэрства распаўсюджвала пісьмо з рэкамендаваным узроўнем закупачных цэн, калі закупляць «другі хлеб» не рэкамендавалася ніжэй азначанага ўзроўню.

Сяргей РАСОЛЬКА.

ВЫНАЙШЛІ ТРАЛЕЙБУС

Сталічнае прадпрыемства «Белкамунмаш» прадставіла новую ўніверсальную мадэль тралейбуса. На яе выраб затрачана каля 200 тыс. долараў, — паведаміў намеснік генеральнага дырэктара «Белкамунмаш» Мікалай Краўчанка.

Аднак расходы хутка сябе акупяць за кошт таго, што тралейбус спажывае электраэнергіі ў сярэднім на 55 працэнтаў менш. Прадугледжана аўтаматычная сістэма падтрымкі тэмпературы ў салоне, або клімат-кантроль. Новая мадэль электрамашыны здольна праехаць з поўным салонам пасажыраў без кантакту з правадамі не менш за пяць кіламетраў...

Аляксандр ФІЛІПОВІЧ, *«Мінск-Навіны».*

БЫВАЙ, «ІКАРУС»: АЎТОБУС-СІМВАЛ

Да 940-годдзя Мінска сталічныя ўлады падрыхтавалі жыхарам і гасцям горада своеасаблівы падарунак: з 5 верасня з вуліц знікнуць апошнія «Ікарусы».

На сённяшні дзень «Ікарусы» маральна састарэлі, — канстатуюць спецыялісты КУП «Мінсктранс». А што тут дзіўнага: першы прадстаўнік гэтага «сямейства» з'явіўся на вуліцах Мінска амаль 40 гадоў таму. Праз шэсць гадоў у сталіцы пачалі «бегаць» і славутыя «гармонікі», у якіх колькасць месцаў дасягала 180-ці. Цяпер жа на змену «Ікарусам» павінны прыйсці больш сучасныя аўтобусы «МАЗ». Трохдзверныя «венгерцы» зніклі з вуліц Мінска недзе паўтара месяца назад, а хутка надыдзе і чарга «гармонікаў». Апошнія 35 з іх будуць развозіць пасажыраў яшчэ некалькі дзён. Праўда, канчаткова з нашага жыцця яны ўсё ж пакуль не знікнуць: машыны плануецца прадаць, напрыклад, фірмам для перавозкі рабочых на будоўлі. А пакуль ёсць шанц развітацца з адным з сімвалаў нашага ранейшага жыцця на адным з апошніх гарадскіх пасажырскіх маршрутаў...

Сяргей РАСОЛЬКА.

ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

БУШ ПРОСІЦЬ ЯШЧЭ 50 МЛРД НА ВАЙНУ

Прэзідэнт ЗША Джордж Буш мае намер звярнуцца да Кангрэса з просьбай дадаткова выдатказаць 50 млрд долараў на вядзенне вайны ў Іраку, — піша The Washington Post.

Як мяркуецца, гэты запыт будзе накіраваны пасля парламенцкіх слуханняў у верасні, падчас якіх свае справаздачы аб становішчы ў Іраку прадставяць генерал Дэвід Петрэус і пасол ЗША ў гэтай краіне Райан Крокер. Яны павінны аканіць эфектыўнасць стратэгіі ЗША ў Іраку і пераканаць Кангрэс, што для замацавання поспеху выводзіць амерыканскі кантынгент заўчасна. Выданне адзначае, што сродкі неабходны для контрнаступлення, якое патрабуе павелічэння амерыканскіх войскаў на 28 тыс. (да 160 тыс.).

Варта адзначыць, што ў абаронным бюджэце на 2008 год ужо прадугледжана фінансаванне іракскіх аперацый у памеры 460 млрд долараў. Акрамя таго, запыт на дадатковае фінансаванне на суму 147 млрд долараў знаходзіцца на стадыі разгляду.

НА РУКАХ У РАСІЯН — 13 МЛН АДЗІНАК АГНЯСТРЭЛЬНАЙ ЗБРОІ

Амаль кожны дзесяты жыхар Расіі з'яўляецца ўладальнікам агнястрэльнай зброі. Такія высновы прыведзены ў справаздачы спецыялістаў з Інстытута міжнародных даследаванняў, Жэнева, якая складзена на падставе інфармацыі, прадстаўленай урадам, паведамленняў СМІ і прыватных даследаванняў.

Па сумарнай колькасці зброі Расія знаходзіцца на дзевятым месцы ў свеце. Самай узброенай нацыяй у свеце з'яўляюцца амерыканцы, дзе на кожныя 100 чалавек прыпадае 90 адзінак агнястрэльнай зброі. Следам за ЗША па долі ўзброеных грамадзян ідуць Емен і Фінляндыя, дзе колькасць адзінак агнястрэльнай зброі складае адпаведна 61 і 56 на кожныя 100 чалавек. З усіх 875 млн адзінак агнястрэльнай зброі, якая маецца ў свеце, 270 млн знаходзяцца на руках у жыхароў ЗША, 46 млн — Індыі, 40 млн — Кітая. Аднак пры гэтым у двух апошніх краінах паказчык адзінак зброі на 100 чалавек складае ўсяго 4 і 3 адзінкі адпаведна. Як сведчыць справаздача, з сусветнай агнястрэльнай зброі на ўзбраенні арміі знаходзіцца толькі 225 млн адзінак, у той час як на руках прыватных уладальнікаў — 650 млн. Пры гэтым толькі 12 працэнтаў апошніх афіцыйна зарэгістраваны.

ІЗРАІЛЬ ПАТРАБУЕ АД ЛІТВЫ СПЫНІЦЬ БУДОЎЛЮ НА ТЭРЫТОРЫІ ЯЎРЭЙСКІХ МОГІЛАК

Міністр па справах рэлігіі Ізраіля Іцхак Коэн запатрабаваў ад уладаў Літвы спыніць у Вільнюсе будаўнічыя работы на тэрыторыі, дзе ў мінулым маглі быць яўрэйскія пахаванні.

«Не сумняваюся, што на гэтай тэрыторыі ў цэнтры Вільнюса з XVI стагоддзя знаходзіліся яўрэйскія могілкі, якія былі закрыты ў XIX стагоддзі», — паведаміў Коэн пасля сустрэчы з мэрам Вільнюса Юозасам Імбрасасам. Коэн патрабуе, каб улады Літвы і Вільнюса не толькі спынілі будаўніцтва на тэрыторыі былых могілак, але і прывялі гэту тэрыторыю ў стан, у якім яна была да пачатку будаўніцтва. Як адзначыў міністр Ізраіля, у савецкія часы «ніхто нічога не пытаўся, але цяпер, калі Літва з'яўляецца членам ЕС, свабоднай і дэмакратычнай дзяржавай, пра будаўніцтва ў такім месцы не можа быць і размовы».

БРЫТАНСКІЯ ТУРЭМШЧЫКІ ЗАБАСТАВАЛІ

Турэмныя наглядальнікі Англіі і Уэльса ўчора аб'явілі адназдзённую забастоўку, патрабуючы павышэння заработнай платы і паляпшэння ўмоў працы.

Паводле слоў бастуючых, да іх ставяцца горш, чым да зняволеных, якіх яны закліканы ахоўваць. Усяго забастоўкай ахоплена 140 турмаў.

БЕЛАРУСБАНК 1922-2007 85 ЛЕТ

АСБ «Беларусбанк» сообщает, что с **3 сентября 2007 г.**
снижаются ПЛАТЫ по международным карточкам
MasterCard (Mass, Business, Gold), VISA (Classic, Gold), Maestro и VISA Electron

за замену карточки до 10 долларов США; срочное оформление карточки до 10 долларов США; снятие наличных денежных средств (со счета в долларах США и евро) в банке, в банкоматах банка до 0,5% от суммы операции;

- исключаются платы за открытие карт-счета; оформление карточки; перевыпуск, обновление карточки; срочный перевод денег на карт-счет; оплату товаров, услуг при расчетах за пределами Республики Беларусь (в т.ч. по микропроцессорным карточкам VISA Electron стандарта EMV); утерю карточки;

- устанавливается минимальная сумма вознаграждения за снятие наличных денежных средств в других банках и банкоматах других банков (со счета в белорусских рублях) в размере 6 000 белорусских рублей;

- снижается плата за первый и второй год обслуживания дополнительной карточки Maestro, VISA Electron до 3 долларов США.

Изменяется плата за обслуживание следующих карточек:

Плата за обслуживание карточек, доллары США	*MasterCard Mass VISA Classic*	*MasterCard Business*	*MasterCard Gold VISA Gold*
основной:			
- за первый год обслуживания	30/40*	50	80/85*
- за второй год обслуживания	25/35*	45	75/80*
- за третий и каждый последующий год обслуживания	20/30*	40	70/75*
дополнительной:	15/20*	-	50/55*

*микропроцессорные карточки VISA стандарта EMV.

Исключается плата за открытие карт-счета по корпоративным карточкам Maestro (для использования только в Республике Беларусь).

http://www.belarus-bank.by

Лицензия на осуществление банковской деятельности №1 от 27.10.2006 г., выданная Национальным банком Республики Беларусь.

ISSN 1990 - 763X

КУРСЫ ВАЛЮТ

Курсы замежных валют, установленыя НБ РБ з 30.08.2007 г. (для б/н разлікаў)	
1 долар ЗША	2 147,00
1 еўра	2 921,10
1 латвійскі лат	4 165,29
1 літоўскі літ	846,06
1 чэшская крона	105,77
1 польскі злоты	759,21
1 расійскі рубель	83,34
1 украінская грыўня	427,90

Курсы замежных валют для безнаяўных разлікаў	
Цэнтрабанк РФ	
USD	25,7630
10 UAH	51,2248
1000 BYR	11,9737
EUR	35,0042
Курс у гандлёвых кампаніях (на 29.08.2007 г.)	
USD	2140 / 2210

Агенцтва Уладзіміра Граўцова

Падпісацца на часопіс «Главный бухгалтер. ГЗ» на 2007 год у рэдакцыі па самай выгаднай цане. Тэлефон рэдакцыі: 209-69-01.

КУП «Минский областной центр учета недвижимости»

проводит открытый аукцион по продаже обращенной в доход государства производственной базы 1991 года постройки со всеми коммуникациями, расположенной в д. Дубеи Солигорского района Минской области (вдоль трассы Минск--Микашевичи) на земельном участке пл. 7,8961 га. Начальная цена снижена на 20 % – 3 376 490 210 белорусских рублей. Подробное извещение опубликовано в газете «Звязда» от 06 июня 2007 г. Порядок проведения аукциона оговорен в условиях его проведения. Аукцион состоится **20 сентября 2007г.** в 15.00 по адресу: г. Солигорск, ул. Козлова, 35, актовый зал. Заявление на участие и необходимые документы принимаются по **19 сентября 2007 г.** до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, к. 326.

КОНТАКТНЫЙ ТЕЛЕФОН (8-017) 224-61-34.
НАШ САЙТ В ИНТЕРНЕТЕ: WWW.RLT.BY.

КУП «Минский областной центр учета недвижимости»

проводит открытый аукцион по продаже обращенного в доход государства объекта незавершенного строительства (без консервации) в составе: административное здание, производственный корпус молочного завода, расположенного по адресу: г. Смолевичи, ул. Социалистическая, 54. Начальная цена снижена на 20 % – 1 345 016 460 бел. руб. Размер задатка составляет 5 % от начальной цены и перечисляется на р/с 3012020200010 Октябрьское отделение ОАО «БПС-Банк» МФО 153001357, УНП 690324015 КУП «Минский областной центр учета недвижимости». Объект продается без условий. Земельный участок будет предоставлен победителю аукциона в установленном законодательством порядке по решению местного исполкома. Оплата за объект производится в течение 2 (двух) месяцев и 25 (двадцати пяти) дней со дня подписания протокола о результатах аукциона. Порядок проведения аукциона оговорен в условиях его проведения. Аукцион состоится **18 сентября 2007 г.** в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, ком. 321. Заявление на участие и необходимые документы принимаются по **17 сентября 2007 г.** до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, ком. 326.

Контактный телефон (8-017) 224-61-34.
Наш сайт в Интернете: www.rlt.by.

Жыллё маё

СТАЛІЧНЫЯ ПАКУПНІКІ ПРАЧЫНАЮЦЦА, А Ў РЭГІЁНАХ ПРАЦЯГВАЕЦЦА МЁРТВЫ СЕЗОН?

Гэта лета стала паказальна сезонным амаль для ўсіх удзельнікаў другаснага рынку нерухомасці. У сезон адпачынкаў актыўнасць патэнцыяльных пакупнікоў знізілася амаль да нуля, аднак змяненне цэн на розныя віды нерухомасці ў розных рэгіёнах адрозніваецца.

Фота Пятра ФАМІНА.

Мінск рыхтуецца да чарговага буму?

Амаль усё лета патэнцыяльныя пакупнікі сталічнай нерухомасці амаль не заўважалі другасны рынак сталіцы. У ліпені спецыялісты нават заўважылі, што пры рэальных здзелках прадаўцы пачалі ісці на ўступкі і гатовы былі скідваць да стартавага кошту 1—1,5 тысяч доларaў. Гэтым летам на другасным рынку сталічнага жылля існаваў яшчэ адзін псіхалагічны фактар. Усе чакалі вынікаў свабодных таргоў, калі на аўкцыёне кліентам прапаноўваліся кватэры без адзелкі ў новым доме. Аўкцыёны адбыліся, усе кватэры (больш за 100) прададзены. Жыллё ААТ «МАПІД» было прададзена даволі дорага, калі кошт квадратнага метра ў залежнасці ад тыпу кватэры дасягаў 1,6—1,9 тыс. долараў. Гэтыя кватэры ў новым доме мелі даволі вялікую агульную плошчу, таму былі па кішэні далёка не кожнаму жыхару сталіцы.

Зараз сталічныя прадаўцы супакоіліся, бо ўпэўніліся, што попыт на мінскую нерухомасць даволі трывалы і грошы ў пэўнай катэгорыі людзей ёсць. Мабыць, менавіта таму ў апошнюю дэкаду жніўня цэннікі прапаноў сталічнага жылля пачалі крыху расці. Агенцтвы нерухомасці пачалі наведваць не толькі прадаўцы, але і сур'ёзныя пакупнікі. Гэты факт быў адразу заўважаны рынкам, а ў выніку за мінулы тыдзень квадратны метр адна-, і двухпакаёвых кватэр стаў даражэйшым на 7—10 долараў.

Сёння сярэдні кошт аднапакаёвай кватэры складае 70 тыс. плюс—мінус 200 долараў, а «квадрат» такога жылля — 2050 долараў. Сярэдняя па якасці і плошчы двухпакаёвая кватэра каштуе каля 95 тыс. долараў, а квадратны метр агульнай плошчы такога жылля роўны 1960 доларам. Таксама крыху падаражэлі і трохпакаёвыя кватэры, сярэдні кошт якіх сёння дасягае 131,7 тыс. долараў, калі квадратны метр ацэньваецца ў 1945 долараў.

Аднак прыкметай летняга перыяду сталічнага рынку нерухомасці стала істотнае павелічэнне прапаноў на продаж або абмен асобных пакояў у звычайных стандартных кватэрах. Больш за тое, цэны на такую нерухомасць за апошнія некалькі месяцаў толькі павысіліся. Кошт невялікага пакойчыка дасягае 32—40 тыс. долараў. Самае цікавае, што гэта не проста прапанова, на такое жыллё ёсць свой пакупнік.

Уладзімір Кабанаў адзначае, што аднапакаёвыя кватэры каштуюць зараз ад 27 да 34 тыс. долараў. Двухпакаёўкі ў старых дамах з маленькай плошчай прапаноўваюцца за 35 тыс., а падобнае жыллё сучаснай планіроўкі — да 44 тыс. долараў. Трохпакаёвыя кватэры можна набыць за 43—55 тыс. долараў.

Дырэктар агенцтва лічыць, што стабільная сітуацыя з сённяшнімі цэнамі на кватэры захаваецца яшчэ пару месяцаў, разам з тым ён адзначыў, што за лета кошт якасных жылых дамоў і сучасных катэджаў узрос прыкладна на 20—30 тыс. долараў. Сёння такое жыллё каштуе ўжо ад 50 да 220 тыс. долараў. Між іншым, зараз адносна танных катэджаў па 50—80 тыс. долараў ужо амаль не засталося. За два апошнія месяцы істотна падаражэлі зямельныя ўчасткі, якія былі адведзены пад будаўніцтва жылля. З 5 тыс. долараў яны падаражэлі ў разы і каштуюць сёння да 15—20 тысяч. Падобных участкаў на другасным рынку вельмі мала. Спачатку агенцтва ажыццяўляе на іх кансервацыю незавершанага будаўніцтва, пасля чаго пакупніку прадаецца ўжо цэльны аб'ект нерухомасці.

Суразмоўца паведаміў, што зараз у Віцебску муніцыпальнае і долевае будаўніцтва перажывае этап другога нараджэння, мабыць, таму і старыя кватэры на другасным рынку ўжо не карыстаюцца павышаным попытам. Разам з тым, спецыялісты лічаць, што ў пачатку зімы нават звычайныя кватэры на другасным рынку пачнуць даражэць.

Брэст чакае танных крэдытаў

Паводле інфармацыі дырэктара дзяржаўнага агенцтва па аказанню рыэлтарскіх паслуг Брэста Анатоля Вайтовіча, цэны ў гэтым горадзе на кватэры вельмі розныя, што залежыць ад плошчы і якасці жылля, узросту і тыпажу дамоў, а таксама адлегласці ад цэнтра горада. Самымі таннымі з'яўляюцца аднапакаёўкі-маласямейкі за 27—28 тыс. долараў. Сярэдні кошт аднапакаёвак складае 35 тысяч, а вельмі якасных кватэр — 45 тысяч долараў. Двухпакаёвыя кватэры, у залежнасці ад усіх фактараў, могуць каштаваць ад 45 да 62 тыс. долараў. Рэальна звычайную двухпакаёўку ў Брэсце можна прадаць за 50—52 тыс. долараў. Трохпакаёвыя кватэры тут каштуюць ад 62 да 75 тыс.

Прыкладна з пачатку ліпеня колькасць прапаноў кватэр у горадзе над Бугам павялічылася ў некалькі разоў. Аднак даволі высокія цэны так моцна спалохалі пакупнікоў, што яны шукаюць сёння танныя адна-, і двухпакаёўкі. Між іншым, кошт квадратнага метра аднапакаёвак вагаецца ад 1000 да 1300 долараў. Згодна з інфармацыйнымі каталогамі, цэны за апошні месяц на жыллё не змяніліся, але... Анатоль Вайтовіч упэўнены, што пры рэальных здзелках са стартавага цэнніка можна скінуць 2—3 тыс. долараў.

На думку суразмоўцы, восенню колькасць пакупнікоў павінна павялічыцца, таму і цэны на жыллё могуць папаўзці ўгору. Эксперт упэўнены, што мёртвы сезон у Брэсце на другасным рынку ўсталяваўся дзякуючы даволі дарагім крэдытам, якія прапануюцца банкам пад набыццё жылля. Калі яны будуць больш таннымі, то гэта істотна актывізуе гарадскі рынак.

На першасным рынку нерухомасці будаўніцтва ажыццяўляецца галоўным чынам для «чаргавікоў», а камерцыйнага жылля ўзводзіцца вельмі мала. Разам з тым новае жыллё па высокаму кошту пагаджаюцца набываць адзінкі.

Раней кватэры ў новым доме прапаноўваліся па 1070 долараў за квадратны метр. Сёння камерцыйная фірма аб'явіла аб летніх скідках і «квадрат» у новабудоўлі ўжо каштуе 1020 долараў. Зараз у Брэсце ўзводзяцца і 4 дамы па лініі долевага будаўніцтва.

Віцебскія кватэры становяцца больш таннымі, а катэджы — больш дарагімі

Кіраўнік РУП «Дзяржаўнае агенцтва нерухомасці Віцебска» Уладзімір Кабанаў адзначае, што ў горадзе ў апошнія месяцы назіраецца тэндэнцыя да павелічэння коштаў на кватэры. Так, за апошнія 2 месяцы кошт аднапакаёвых кватэр вырас на 2—3 тыс. долараў, двухпакаёвых — на 3—4 тыс. долараў, трохпакаёвых — на 4—5 тыс. долараў. Самымі таннымі ў горадзе з'яўляюцца аднапакаёвыя кватэры ў старых дамах, якія можна набыць за 20—25 тыс. долараў. Двухпакаёвыя кватэры ў старых дамах каштуюць ад 30 тыс. долараў. Трохпакаёвыя кватэры ў старых дамах каштуюць ад 40 тыс. долараў.

Прадаюцца кватэры ў новых дамах, якія будуюцца ў раёне Віцебскага домабудаўнічага камбіната, Задуб'я, Фрунзенскага раёна, Юбілейнага мікрараёна. Аднапакаёвыя кватэры ў новых дамах каштуюць ад 30 тыс. долараў, двухпакаёвыя — ад 40 тыс. долараў, трохпакаёвыя — ад 50 тыс. долараў. Самымі дарагімі з'яўляюцца кватэры ў элітных дамах, якія будуюцца ў цэнтры горада. Аднапакаёвыя кватэры ў такіх дамах каштуюць ад 40 тыс. долараў, двухпакаёвыя — ад 50 тыс. долараў, трохпакаёвыя — ад 60 тыс. долараў.

Прамая лінія

БІЛЕТ ПРАЗ ІНТЭРНЭТ?.. КАЛІ ЛАСКА

Пытанням развіцця новых паслуг на Беларускай чыгунцы была прысвечана «прамая лінія» Першага Нацыянальнага канала Беларускага радыё. Радыёжурналіст Максім Угляніца і карэспандэнт «Звязды» гутарылі з вядучым інжынерам пасажырскай службы Беларускай чыгункі Канстанцінам БАЯРАМ пра тое, якія дадатковыя маршруты паяздоў плануецца ўводзіць у Беларусі. Не засталіся па-за ўвагай і пытанні наконт таго, калі чакаць росту тарыфаў на пасажырскія перавозкі і калі ў рэспубліцы з'явяцца высакахуткасныя цягнікі. Сёння мы прапануем чытачам адказы на найбольш актуальныя пытанні, што прагучалі падчас «прамой лініі».

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

— Канстанцін Мікалаевіч, напачатку нашай гутаркі хацелася б даведацца, колькі на Беларускай чыгунцы паяздоў абслугоўваюць менавіта пасажырскія перавозкі?

— У графіку руху паяздоў 2007—2008 гадоў, якім мы зараз карыстаемся, запланавана і курсіруе 108 пар пасажырскіх паяздоў, з якіх 85 — міжнародныя пасажырскія паязды, а таксама запланавана і курсіруе 417 пар прыгарадных паяздоў, з якіх 30 працэнтаў прыходзіцца на Мінскую прыгарадную зону. Астатнія — паязды мясцовых зносінаў. Калі параўноўваць з краінамі СНД у тэрытарыяльных і адміністратыўных прапорцыях, то гэта вельмі вялікія аб'ёмы.

— А наколькі актыўна абнаўляецца парк чыгункі?

— На жаль, парк пасажырскіх вагонаў у нас ужо старэе. Вагоны, якія мы прызвычаіліся бачыць, выраблялiся ў Германіі яшчэ пры Савецкім Саюзе. Праўда, апошнім часам ідуць закупкі вагонаў на Цвярскім заводзе, вырабляюцца яны і на айчынных прадпрыемствах. Летась Беларуская чыгунка закупіла парадку 20 вагонаў, плануецца, што да канца гэтага года будзе набыта столькі ж.

— Цікава, колькі складае кошт вагона, які закупляе наша чыгунка?

— У залежнасці ад катэгорыі — плацкарт, купе, СВ — кошт вар'іруецца і можа даходзіць да 800 тыс. долараў ЗША.

— Размова ідзе пра суперукамплектаваны вагон?

— Не, гэта кошт вагона, які выкарыстоўваецца штодзённа на чыгунцы. Канешне, гэта добрыя вагоны, з кандыцыянаваннем, з інфармацыйным табло. Аднак апошняе — не нейкая вытанчанасць, а рэальнасць часу.

— Ці плануе Беларуская чыгунка ўводзіць у бліжэйшы час новыя маршруты?

— Мы кожны год распрацоўваем графік руху паяздоў. Натуральна, разглядаюцца і новыя маршруты, новыя напрамкі. Так, са снежня, калі ў нас уводзіцца міжнародны графік пасажырскіх паяздоў дальніх зносінаў, якія ідуць у краіны Еўропы і іншыя дзяржавы, запланаваны да ўводу маршруты «Мінск—Амстэрдам», «Мінск—Берлін», вяртаемся да маршруту «Мінск—Будапешт» праз Браціславу. Акрамя таго, і на расійскім напрамку сёлета поезд «Мінск—Іркуцк» курсіраваў летам ужо два разы ў тыдзень.

— А ўнутры краіны з'явіцца новыя маршруты, ці, наадварот, некаторыя з іх будуць скарочаны?

— У рэспубліцы праводзіцца аналіз пасажырапатоку, разглядаюцца ўжо існуючыя напрамкі. Мы стараемся не дапусціць нейкіх непрыемных нечаканасцяў, а таму з пасажырскімі паездкамі ўсё застаецца стабільным, усё выраўнена па ўжо існуючаму пасажырапатоку.

— Сезон водпускаў заканчваецца, але, тым не менш, як будзе развівацца сітуацыя з крымскім напрамкам, які карыстаецца павышаным попытам у нашых суайчыннікаў?

— Улічваючы, што ў апошнія гады ўзрос попыт на крымскі напрамак, у нас была павялічана перыядычнасць курсіравання паяздоў на ім. Калі раней поезд у Еўпаторыю курсіраваў праз дзень, то цяпер — штодзённа. На Феадосію ажыццяўляюцца таксама штодзённыя пасажыраперавозкі. Да таго ж дабаўлена парадку трох паяздоў на Сімферопаль: мы пастараліся ўлічыць попыт грамадзян на гэтым напрамку. Аднак мы не забываліся і пра іншыя напрамкі, у прыватнасці, пра паўночны. Так, на Мурманск у нас летам курсіруе поезд тры разы на тыдзень. Павялічылася перыядычнасць руху і на Новасібірск.

— Многіх хвалюе пытанне, якія змены чакаюць пасажыраў з тарыфамі?

— Што датычыцца прыгарадных і мясцовых перавозак, гэта значыць унутры рэспублікі, то яны пакуль застаюцца нерэнтабельнымі. З мэтай выхаду на больш рэнтабельны ўзровень у бліжэйшы час плануецца павышэнне тарыфаў. Аднак нязначнае: калі зараз кошт праезду адной зоны каштуе 440 рублёў, то, магчыма, ён вырасце да 460 рублёў.

— Многіх цікавіць, чаму поезд ідзе, умоўна кажучы, з пункту «А» ў пункт «В» тры гадзіны, а не адну, хаця на той жа машыне можна даехаць туды хутчэй?

— Чалавек, які перамяшчаецца на ўласным аўтамабілі, едзе з пункту «А» канкрэтна ў пункт «В». Адпаведна закону аб чыгуначным транспарце, апошні з'яўляецца транспартам грамадскага карыстання і павінен улічваць інтарэсы ўсіх пасажыраў, якія перамяшчаюцца па гэтаму маршруту. Напрыклад, паміж Мінскам і Барысавам ёсць шмат прыпынкаў і станцый, і людзям патрэбна даехаць да іх. Таму мы павінны ўлічваць інтарэсы ўсіх. Натуральна, што з павелічэннем колькасці прыпынкаў павялічваецца і час знаходжання ў дарозе.

— Слухач цікавіцца, чаму ні адзін поезд, які ідзе з Мінска, не робіць прыпынак на нашай станцыі?

— Ёсць шмат станцый і напрамкаў, на якіх нашы паязды не спыняюцца. Справа ў тым, што пры пракладцы і распрацоўцы графіка руху прыпынак вызначаецца з дарогай, на якой ён знаходзіцца. Калі па статыстыцы высвятляецца, што на прыпынку няма дастатковай колькасці пасажыраў для пасадкі і высадкі, то поезд можа не спыняцца. Але пры гэтым улічваецца, што да бліжэйшай вузлавой ці буйной станцыі ёсць прыгарадныя зносіны, якія чалавек можа скарыстаць з перасадкай.

— А якія скарасныя перспектывы Беларускай чыгункі?

— Зараз з увядзеннем графіку руху паяздоў у нас узноўлены рух поезда №9/10 «Масква—Брэст—Варшава», які курсіруе з дапушчальнай скарасцю да 140 км/г. Акрамя таго, паміж Масквой і Мінскам курсіруе поезд №7/8, у якога такая ж дапушчальная скарасць. Пры развіцці скарасного руху неабходна ўлічваць інтарэсы грамадзян, адлегласць, тэхнічныя ўмовы, развіццё інфраструктуры. Прааналізаваўшы сітуацыю, мы пакуль абмежаваліся гэтымі паяздамі. Хаця ў планах, канешне, ёсць развіццё руху са скорасцю да 160 км/г і больш. Аднак гэта патрабуе капітальных укладанняў — змянення пуці, закупкі спецыялізаванага рухомага саставу, лакаматываў.

— Магчыма, Беларуская чыгунка плануе адкрыць асенні сезон з нейкіх новаўвядзенняў.

— У нас з 1 верасня плануецца ўвесці новую паслугу, згодна з якой пасажыры пачнуць набываць з білетам і пасцель. Гэта вельмі зручна: калі чалавек едзе, напрыклад, поездам фарміравання іншых дарог (расійскіх, украінскіх, літоўскіх), то ў білет уваходзіць і кошт пасцелі і няма неабходнасці шукаць замежную валюту, каб за яе разлічыцца. Гэта паслуга не будзе прымяняцца, калі пасажыр едзе ў нашых паяздах: напрыклад, па дарозе з Мінска ў Оршу ён можа набываць пасцель, а можа абысціся і без яе.

Да новых паслуг адносіцца і набыццё праязнога білета праз Інтэрнэт. Гэта перспектыўная паслуга дзейнічае сёлета з мая. Пакуль — у эксперыментальным варыянце, але, мяркую, што эксперымент хутка станоўча завершыцца, і паслуга будзе ўкаранёна паўсюдна. За апошнія тры месяцы 11 тыс. пасажыраў яе ўжо выкарысталі.

— Між іншым, як гэта зрабіць?

— На карпаратыўным сайце Беларускай чыгункі ёсць старонка, у якой выкладзены ўсе ўмовы заказу праязнога дакумента праз Інтэрнэт. Яна даступная і простая для любога карыстальніка Інтэрнэтам, няма ніякай складанасці і ў размяшчэнні заказу.

— Якія льготы сёння прадугледжаны для пасажыраў чыгункі?

— На сённяшні дзень у нас льготамі карыстаюцца 59 катэгорый грамадзян. Канешне, мы разумеем, што льготы — спадчына мінулага. Мабыць, пэўны час яны яшчэ і будуць дзейнічаць. Аднак трэба рыхтавацца да рынкавай сістэмы і адмены нейкай часткі льгот.

— Чым скончыўся эксперымент па ўкараненню ў паяздах купэ для жанчын?

— Гэта ўжо рэальнасць, а не эксперымент. Прычым рэальнасць, якая карыстаецца попытам. А таму гэта паслуга будзе развівацца і далей.

— Адзін з чытачоў пытаецца, ці мае права праваднік адмовіць у пасадцы нецвярозаму чалавеку або высадзіць яго з поезда?

— Мае, таму што нецвярозы пасажыр — гэта вялікая рызыка. У першую чаргу ён вораг самому сабе: можа спатыкнуцца, упасці з пляцы. Калі ў ходзе паездкі пасажыр вядзе сябе неадэкватна, ён можа быць высаджаны з поезда з адпаведнай адзнакай у білеце. Пры гэтым кошт праезду яму не вяртаецца, бо інцыдэнт адбываецца па яго віне.

— Нядаўна на станцыі «Мінск-Пасажырскі» ўведзена сістэма аўдыёзапісу перамоў. З якой мэтай гэта зроблена?

— Увядзенне аўдыёзапісу — гэта фіксацыя размовы паміж пасажырам і абслуговым персаналам. Мяркую, што гэта нікога не пакрыўдзіць. Такая мера патрэбна, каб выключыць нейкія канфліктныя сітуацыі пры выкананні сваіх абавязкаў як пасажырамі, так і чыгуначнікамі. Напрыклад, калі ў пасажыра ўзнікае шэраг прэтэнзій або пытанняў, то фіксацыя размовы можа пацвердзіць іх праўдзівасць і справядлівасць.

Ігар ШЧУЧЭНКА.

Спорт-тайм

Залаты экіпаж

На чэмпіянаце свету сярод інвалідаў па зроку па веласпорту ў французскім Брно не было роўных беларускаму экіпажу Ірына Фядотава і Алена Драздова *(на фота)*. Нашы суайчыннiцы аказаліся першымі на дыстанцыі 19,8 кіламетра з асобным стартам і ў групавой гонцы на 69,3 кіламетра. «Золата» гарантавала ім пропуск на Паралімпійскія гульні-2008 у Пекіне.

Новы скандал і без Матэрацы

Удзельнікі фіналу першынства свету па футболу-2006 зноў нешта не падзялілі. На гэты раз вызначыўся Раймон Даменек, галоўны трэнер віцэ-чэмпіёнаў планеты — зборнай Францыі, які абвінаваціў у артыкуле выдання «Le Parisien» каманду Італіі ў подкупу суддзяў. За безгрунтоўныя падазрэнні Еўрапейскі футбольны саюз пакараў настаўніка штрафам у памеры 6 тыс. еўра, а таксама дысквалiфікацыяй на адзін матч — адборачную сустрэчу з італьянцамі ў Мілане 8 верасня.

Загінуў абаронца «Севілы»

У сувязі са смерцю абаронцы іспанскай «Севілы» Антоніа Пуэрта *(на фота)* матч з клубам АЕК перанесены на 3 верасня. 22-гадовы футбаліст на 30-й хвіліне матча першага тура іспанскага чэмпіянату страціў прытомнасць і нават не ачуняў у шпіталі. Першымі ж удзельнікамі асноўнай сеткі Лігі чэмпіёнаў, якія пераадолелі кваліфікацыйны бар'ер, сталі шатландскі «Рэйнджэрс», італьянскі «Лацыо» і англійскі «Ліверпуль». Мерсісайцы аказаліся двойчы мацнейшымі за французскую «Тулузу» (1:0, 4:0) і без дапамогі траўмаванага капітана Сцівена Джэрарда. Пасля нічыёй дома ў сустрэчы з бухарэсцкім Дынама» (1:1) «Лацыо» святкаваў перамогу ў гасцях (3:1). «Рэйнджэрс» абышоўся мінімальнай перавагай над бялградскай «Црвенай звездой»: 1:0 на сваім полі і нулявая нічыя ў Сербіі.

Вяртанне ветэрана

Чэх Томаш Хлубна планаваў завяршыць сваю кар'еру на радзіме, аднак 35-гадовы хакеіст вырашыў вярнуцца ў стан клуба «Юнацтва—Мінск», дзе ў мінулым сезоне за свае поспехі заслужыў прыз глядацкіх сімпатый. З уладальнікамі Кантынентальнага кубка Хлубна заключыў новы кантракт на год.

Мароз у «Металургу»

Беларускі паўабаронца Уладзімір Мароз перайшоў у запарожскі «Металург». 21-гадовы футбаліст, які выступаў за сталічны «Лакаматыў», далучыўся ва ўкраінскай камандзе да сваіх землякоў — калегі па амплуа Мікалая Кашэўскага і абаронцаў Яна Цігарава і Арцёма Чалядзінскага. Пасля сямі тураў «Металург» займае 3 месца ў чэмпіянаце Украіны.

А МОГ БЫ ЖЫЦЬ...

Таксіст, які заснуў за рулём, урэзаўся ў агароджу на 14-м кіламетры Магілёўскай шашы. У выніку сутыкнення вадзіцель «Фіята» службы «107» вылецеў праз лабавое шкло і загінуў. Ён не быў прышпілены рэменем бяспекі. У дадзенай сітуацыі гэтыя абставіны аказаліся ракавымі.

Максім ГУЛЯКЕВІЧ, «Мінск-Навіны».

Погляд

АБСЕРЫЯЛІЛІСЯ...

Хто ўважліва слухае радыё і глядзіць тэлебачанне, лёгка заўважае даволі прыкметнае паляпшэнне зместу перадач. І я, і многія мае знаёмыя з задавальненнем слухаем «Радыёфакт», «Сельскую раніцу», «Мінскія навіны», любім перадачы пра беларускую культуру, музычна-забаўляльныя праграмы, асабліва тыя, якія гучаць па-беларуску. Ёсць удалыя праграмы і ў тэлевізійнікаў. Але ўсё ж даволі часта бывае, што перадач — безліч, каналаў — мора, а паглядзець няма чаго. Сядзіш, шчоўкаеш пераключальнікам, а атрымліваеш толькі чарговы кавалак бясконцых ахаў, уздыхаў, пустых перажыванняў, а то і таго горш — страляніна, турэмны жаргон... «Не радзіся прыгожай», «Сёстры па крыві», «Забойная сіла», «Расплата за грахі...» павольна перацякаюць з канала на канал, засмечваючы тэлеэфір. А мне, тэлеспажыўцу, за якія гэта грахі? Усё гэта вельмі далёкае ад жыцця, ад нашай нацыянальнай культуры, нашых традыцый. Мне, сталаму чалавеку, было б тым не менш цікава паглядзець перадачу пра жыццё навучальных устаноў, пра клопаты студэнцтва — гэта ж наш заўтрашні дзень. Ды і пра жыццё нашых звычайных сем'яў было б больш цікава паглядзець перадачу, чым пра серыяльныя інтрыгі і жарсці...

Ці ўзяць забаўляльныя, музычныя праграмы. Я даўно ўжо вывучыў некалькі прозвішчаў нашых зорак. У розных варыяцыях яны вандруюць з аднаго беларускага тэлеканала на другі. Слоў няма, добрыя яны артысты, але і мёд прыядаецца. А ў кожным жа нашым раёне ёсць адметныя самадзейныя калектывы, выступленні якіх зачаруюць любога слухача! На адной толькі маёй Ельшчыне цудоўныя мастацкія калектывы і ў самім райцэнтры, і ў Зашыр'і, у Стара-Высокім, у Добрыне... Вось бы тут запусціць серыял! Перадачы на нашым матэрыяле, на нашых традыцыях не навучаць брыдкаслоўю, цынізму, гвалту.

Тэлебачанне — вялікая сіла. Яно адвучвае маладых людзей чытаць мастацкую літаратуру, газеты, наведваць кіназалы і тэатры. Таму ўздзеянне на чалавека мае вялізнае. І гэтым трэба ўмела карыстацца — без дыдактыкі, без пафасу, але ж і без бясконцых серыялаў. Людзі на тэлебачанні працуюць пісьменныя, прыгожыя, і гэта ім пад сілу.

Уладзімір ГУД,
ветэран Вялікай Айчыннай вайны,
Заслужаны настаўнік Рэспублікі Беларусь.

Інфарм-укол

ХВОРЫЯ ДОЎГА СПЯЦЬ

Японскія вучоныя з універсітэта Нагоі высветлілі: даўжэй за ўсіх жывуць тыя, хто спіць па 6,5—7,5 гадзіны ў суткі.

Тыя, хто праводзіць у ложку менш за 4,5 гадзіны, скарачаюць сваё жыццё ў 1,6 раза. А тыя, хто спіць звыш 9,5 гадзіны, — у 1,9 раза. Даследчыкі пакуль не паведамляюць, чаму так не пашанцавала менавіта соням, але ёсць меркаванне, што звыш меры спіць той, хто нездаровы.

ДЫЕТЫЧНАЯ ГАЗІРОЎКА ПСУЕ ЗУБЫ

Згодна з апошнімі амерыканскімі даследаваннямі, дыетычныя газіраваныя напоі не такія бяскшодныя, як здаецца.

Яны дапамагаюць захаваць фігуру, але здольны сур'ёзна нашкодзіць зубам. «Большасць нізкакаларыйных газіраваных напояў утрымлівае разбуральную для эмалі фосфарную і/або лімонную кіслату. Яны не настолькі небяспечныя, як салодкія ліманады, але і прыроўніваць іх да вады ці ахалоджанага чаю нельга. Калі вы не можаце адмовіцца ад газіроўкі, піце яе праз саломінку, каб звесці негатыўны эфект да мінімуму.

БОЛЬШ СОЛІ — ГОРШ СЭРЦУ

Соль, або хларыд натрыю, — адна з важнейшых умоў падтрымання пэўнага складу крыві і водна-солевага балансу. А паколькі наш арганізм самастойна выпрацоўваць гэты мінерал не ўмее, то соль трэба штодня атрымліваць з ежай.

Калі яе будзе надта мала, не пазбегнуць стомленасці, смагі, слабасці, спазмаў мышцаў ног і пальцаў. Поўная ж адсутнасць солі прыводзіць да яшчэ больш сур'ёзных наступстваў — сонечных і цеплавых удараў, страты прытомнасці, аслаблення мыслення. З другога боку, у лішку солі ў арганізме таксама няма нічога добрага. У здаровага чалавека яе выводзіцца за суткі да 25 г. Значыць, калі ён ужывае звыш 25 г солі ў дзень, то лішак назапашваецца ў арганізме. Калі так адбываецца працяглы час, то чалавек паступова ператвараецца ў склад прасоленых тканак. Гэта неспрыяльна адбіваецца на ўсім арганізме — узнікае дэфіцыт калію, што ў далейшым пагражае сур'ёзнымі праблемамі з сэрцам.

КІШЭЧНІК — НЕ СМЕТНІК

Кішэчнік — ахвяра дрэннай экалогіі. Што толькі ні трапляе ў наш арганізм з паветрам, вадой і ежай: прамысловая атрута, аксіды і солі цяжкіх металаў, нітраты, пестыцыды, кансерванты... Дый мы самі дадаём праблем.

Харчуемся нерэгулярна, дрэнна пражоўваем ежу. Аддаём перавагу высокакаларыйным прадуктам, якія падвяргаліся працяглай тэрмічнай апрацоўцы і ў якіх мала неабходных для нармальнай дзейнасці кішэчніка клятчаткі, мінералаў і вітамінаў. Акрамя таго, мы засмечваем арганізм яшчэ і лекамі. І п'ём вельмі мала вадкасці. Да таго ж часта адкладваем наведванне туалета да больш зручнага моманту. А калі вырашаем зрабіць гэта, з арганізма выходзіць толькі частка «адпрацаванага паліва». Калі падобнае ўстрымманне адбываецца досыць часта, нервовыя канчаткі кішэчніка паступова перастаюць рэагаваць на ціск калавых мас. Вага «грузу», назапашанага за ўсё жыццё, можа дасягаць 2,5 кг.

А таму будзьце больш уважлівымі да сябе. Не дапускайце выпадкаў нерэгулярнага ачышчэння арганізма, якое павінна быць не штучным (з дапамогай клізмы — да такой працэдуры варта прыбягаць у крайніх выпадках, або рабіць, паводле рэкамендацыі доктара Малахава, курсамі), а натуральным. Для гэтага варта наладзіць свой харчовы і пітны рэжым. Ужывайце паболей агародніны і фруктаў, ешце курагу, кашы, асабліва ячную, піце свежы кефір і шмат вады.

«ЗІМНІЯ» БАЧАЦЬ ЛЕПШ ЗА «ЛЕТНІХ»

Дзеці, народжаныя восенню ці зімой, маюць лепшы зрок, чым тыя, хто з'явіўся на свет у вясенні ці летні перыяд, — лічаць вучоныя

Да такой высновы прыйшлі ізраільскія вучоныя з універсітэта Тэль-Авіва, даследаваўшы зрок 300 тыс. школьнікаў і студэнтаў ад 16 да 23 гадоў. Афтальмолагі скарэліравалі сферу дзеяння блізарукасці з месяцам нараджэння падлеткаў і атрымалі дзіўныя вынікі — народжаныя ў чэрвені і ліпені мелі на 24 працэнты больш высокую рызыку развіцця блізарукасці, чым народжаныя ў снежні і студзені.

Урачы мяркуюць, што дрэнны зрок «летніх» дзяцей звязаны з доўгатэрміновым эфектам уздзеяння натуральнага святла ў час фарміравання плода. Паводле слоў спецыялістаў, вочны яблык блізарукіх людзей падоўжаны, што адбываецца за кошт працяглага дзеяння сонечнага асвятлення і зменшанай выпрацоўкі пігменту мелатаніну, але медыкі пакуль не ўпэўнены.

«Взгляд».

ИНФОРМАЦИЯ ОБ ОТКРЫТОМ АКЦИОНЕРНОМ ОБЩЕСТВЕ, АКЦИИ КОТОРОГО ПРЕДЛАГАЮТСЯ ГРАЖДАНАМ ДЛЯ ОБМЕНА НА ИМЕННЫЕ ПРИВАТИЗАЦИОННЫЕ ЧЕКИ «ИМУЩЕСТВО» ЧЕРЕЗ ОБОСОБЛЕННОЕ ПОДРАЗДЕЛЕНИЕ АСБ «БЕЛАРУСБАНК»

№ п/п	Наименование акционерного общества, адрес, телефон	Уставный, фонд штук, акций	Доля государства в уставном фонде (%)	Номинальная стоимость 1 акции в рублях	Стоимость акции в чеках (чек/акция)	Количество акций, предлагаемых для обмена	Предмет деятельности акционерного общества
1	2	3	4	5	6	7	8
1.	Открытое акционерное общество «Борисовбытспецсервис», 222525, Минская обл., г. Борисов-15, ул. Братьев Войнрубов, 7; тел. 78-79-58	10635	56,7	4200	1/1	404	Стирка, химчистка и окрашивание текстильных и меховых изделий, производство спецодежды, готовых текстильных изделий, нательного белья

Примечание:
1. Оформление документов для обмена чеков на акции производится в филиале № 612 АСБ «Беларусбанк» г. Борисова.
2. Срок обмена — с 24 сентября 2007 года по 30 июня 2010 года.
3. Для обмена на акции приватизируемых предприятий принимаются чеки, начисленные гражданам, полученные по наследству, а также дополнительно 250 чеков, переоформленных гражданину от близких родственников (родителей, детей, супругов, родных братьев и сестер, внуков, бабушек, дедушек, свекрови, свекра, тестя и тещи).

ПРАВЫ СПАЖЫЎЦОЎ ЖЫЛЛЁВА-КАМУНАЛЬНЫХ ПАСЛУГ

абароняць асобным законам

У Палаце прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па ініцыятыве дэпутатаў ідзе праца над праектам Закона «Аб абароне правоў спажыўцоў жыллёва-камунальных паслуг».

Паводле слоў дэпутата ніжняй палаты беларускага парламента Ганны Буравай, якая ўваходзіць у склад працоўнай групы па падрыхтоўцы законапраекта, сёння існуе агульны дакумент, які абараняе правы ўсіх спажыўцоў у рэспубліцы, — Закон «Аб абароне правоў спажыўцоў». У той жа час, на яе думку, існуе патрэба ў дадатковым рэгуляванні абароны спажыўцоў у сферы ЖКГ. Пра гэта сведчыць велізарная колькасць звароткаў, якія паступаюць у парламент ад грамадзян краіны. Паводле слоў Ганны Буравай, яны складаюць прыкладна палову ад усіх звароткаў да дэпутатаў.

У праекце закона плануецца вялікую ўвагу ўдзяліць праву спажыўцоў на інфармацыю аб паслугах ЖКГ. У прыватнасці, плануецца абавязаць выканаўцу паслуг (юрыдычную асобу, якая аказвае паслугі згодна з дамовай) размяшчаць інфармацыю па месцы свайго знаходжання пра тарыфы на жыллёва-камунальныя паслугі, аб прававым абгрунтаванні ўсталявання гэтых тарыфаў, зацверджаных нарматывах расходу цеплавой энергіі і вады. Там жа павінна быць інфармацыя пра грашовыя сродкі, атрыманыя ад спажыўцоў на тэхнічнае абслугоўванне падведамасной тэрыторыі, пра бюджэтныя паступленні і дзяржаўныя субсідыі і іх штомесячнае выкарыстанне, іншая інфармацыя.

Штогод мясцовыя распарадчыя і выканаўчыя органы павінны будуць праз СМІ інфармаваць спажыўцоў аб суме сродкаў на капітальны рамонт жыллёвага фонду, якія паступілі ад спажыўцоў, аб фактычным выкарыстанні сродкаў, планах па капітальнаму рамонту на наступны год.

У артыкуле законапраекта, які рэгулюе плату за паслугі ЖКГ спажыўцамі, плануецца прадугледзець палажэнне аб тым, што памер платы за тэхнічнае абслугоўванне ў жылых дамах, у якіх адсутнічаюць гарачае і халоднае водазабеспячэнне, каналізацыя, цэнтральнае ацяпленне, «можа змяншацца па рашэнню аблвыканкамаў і Мінгарвыканкама на 10 працэнтаў за кожны адсутны від інжынернага уладкавання».

У выпадку змянення тарыфаў на паслугі ЖКГ выканаўца «не пазней чым за 30 дзён паведамляе пра гэта спажыўцу праз СМІ альбо іншым спосабам з паведамленнем абгрунтаванняў змянення тарыфаў».

Артыкулам, які вызначае правы і абавязкі спажыўца па дамовах на аказанне паслуг, плануецца, у прыватнасці, замацаваць права «не аплачваць асобныя жыллёва-камунальныя паслугі ў перыяд часовай адсутнасці спажыўца і членаў яго сям'і, якія пражываюць сумесна, больш 10 каляндарных дзён запар пры адпаведным дакументальным пацвярджэнні, а та

Закон Рэспублікі Беларусь

Аб унясенні дапаўненняў і змяненняў у некаторыя кодэксы Рэспублікі Беларусь па пытаннях вэксальнага абарачэння

Прыняты Палатай прадстаўнікоў 23 мая 2007 года
Адобраны Саветам Рэспублікі 11 чэрвеня 2007 года

Артыкул 1. Дапоўніць Крымінальны кодэкс Рэспублікі Беларусь ад 9 ліпеня 1999 года (Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 1999 г., № 76, 2/50; 2007 г., № 120, 2/1325) артыкулам 226² наступнага зместу:

«Артыкул 226². Незаконныя дзеянні з простымі і (або) пераводнымі вэксалямі

1. Выдача, індасіраванне, аваліраванне простых і (або) пераводных вэксаляў з буйным памеры, загадзя не забяспечаных маёмасцю, якая патрабуецца ў адпаведнасці з заканадаўствам, у тым ліку маёмаснымі правамі, або іншымі адчужальнымі правамі, якія маюць грашовую ацэнку, або падпісаных асобамі, не здольнымі абавязвацца па іх, або ад імені такіх асобаў, пры адсутнасці прымет службовага ці іншага больш цяжкага злачынства —

караюцца пазбаўленнем права займаць пэўныя пасады або займацца пэўнай дзейнасцю, або папраўчымі работамі на тэрмін да двух гадоў, або арыштам на тэрмін да шасці месяцаў, або пазбаўленнем волі на тэрмін да двух гадоў.

2. Падробка подпісу на простым і (або) пераводным вэксалі або на далучаным да яго дадатковым лісце (алонжы), падпісанне простага і (або) пераводнага вэксаля, у тым ліку пры індасаменце, авале, акцэпце, або дадатковага ліста (алонжа) ад імя выдуманай асобы ці такое іх падпісанне, пры якім пастаўлены подпіс па любой іншай падставе не можа абавязваць асобу, якая паставіла яго, або асобу, ад імя якой дадзены подпіс пастаўлены, —

караюцца абмежаваннем волі на тэрмін ад двух да пяці гадоў або пазбаўленнем волі на тэрмін ад двух да сямі гадоў з канфіскацыяй маёмасці або без канфіскацыі.

3. Прымушэнне да аваліравання, індасіравання або выдачы простага і (або) пераводнага вэксаля, акцэпту пераводнага вэксаля пад пагрозай прымянення насілля над пацярпелым ці яго блізкімі або знішчэння ці пашкоджання іх маёмасці альбо яўнае ўказанне плацельшчыкам у пераводным вэксалі асобы, якая не мае сродкаў для яго аплаты, —

караюцца пазбаўленнем волі на тэрмін ад двух да сямі гадоў.

4. Дзеянні, прадугледжаныя часткамі другой або трэцяй гэтага артыкула, учыненыя паўторна, або арганізавандй групай, або з прымяненнем насілля, —

караюцца пазбаўленнем волі на тэрмін ад пяці да дзесяці гадоў з канфіскацыяй маёмасці або без канфіскацыі.».

Артыкул 2. Унесці ў Кодэкс Рэспублікі Беларусь аб адміністрацыйных правапарушэннях ад 21 красавіка 2003 года (Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 2003 г., № 63, 2/946; № 87, 2/980; 2005 г., № 74, 2/1112; № 120, 2/1128; 2006 г., № 78, 2/1207, 2/1212; № 111, 2/1242; № 112, 2/1245; 2007 г., № 4, 2/1296; № 120, 2/1325) наступныя дапаўненні:

1. Дапоўніць Кодэкс артыкулам 11.59 наступнага зместу:

«Артыкул 11.59. Незаконныя дзеянні з простымі і (або) пераводнымі вэксалямі

1. Выдача, аплата, індасіраванне, аваліраванне простых і (або) пераводных вэксаляў, акцэпт пераводных вэксаляў асобай, якая не мае права на гэта, або выдача, індасіраванне, аваліраванне простых і (або) пераводных вэксаляў, не забяспечаных маёмасцю, якая патрабуецца ў адпаведнасці з заканадаўствам, у тым ліку маёмаснымі правамі, або іншымі адчужальнымі правамі, якія маюць грашовую ацэнку, —

цягнуць накладанне штрафу ў памеры вэксальнай сумы, а на юрыдычную асобу — у памеры вэксальнай сумы.

2. Выдача, індасіраванне, аваліраванне простых і (або) пераводных вэксаляў, выдача іх копій або экзэмпляраў пераводных вэксаляў, акцэпт пераводных вэксаляў юрыдычнай асобай, зарэгістраванай у Адзіным дзяржаўным рэгістры юрыдычных асобаў і індывідуальных прадпрымальнікаў, аперацыі па рахунках якой прыпынены, —

цягнуць накладанне штрафу на юрыдычную асобу ў памеры вэксальнай сумы.

3. Перавышэнне юрыдычнай асобай, зарэгістраванай у Адзіным дзяржаўным рэгістры юрыдычных асобаў і індывідуальных прадпрымальнікаў, установленага заканадаўчымі актамі аб'ёму абавязацельстваў па выдадзеных, індасіраваных, аваліраваных простых і (або) пераводных вэксаляў, акцэптаваным пераводным вэксалям —

цягне накладанне штрафу на юрыдычную асобу ў памеры ад дзесяці да пяцідзесяці працэнтаў сумы перавышэння.».

2. Дапоўніць Кодэкс артыкулам 23.73 наступнага зместу:

«Артыкул 23.73. Непрадстаўленне або несвоечасовае прадстаўленне дакументаў, звязаных са змяненнем рэчавых правоў на простыя і (або) пераводныя вэксалі

Непрадстаўленне або несвоечасовае прадстаўленне фізічнай асобай, якая пастаянна ці часова пражывае на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь, або юрыдычнай асобай, зарэгістраванай у Адзіным дзяржаўным рэгістры юрыдычных асобаў і індывідуальных прадпрымальнікаў, у рэспубліканскае ўнітарнае прадпрыемства «Рэспубліканскі цэнтральны дэпазітарый каштоўных папер» устаноўленых заканадаўчымі актамі натарыяльна заверэных дакументаў у выпадку ажыццяўлення здзелак, накіраваных на змяненне права ўласнасці або іншых рэчавых правоў на простыя і (або) пераводныя вэксалі, іх копіі або экзэмпляры пераводных вэксаляў, —

цягнуць накладанне штрафу ў памеры ад дваццаці да пяцідзесяці працэнтаў вэксальнай сумы.».

Артыкул 3. Унесці ў Працэсуальна-выканаўчы кодэкс Рэспублікі Беларусь аб адміністрацыйных правапарушэннях ад 20 снежня 2006 года (Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 2007 г., № 14, 2/1291; № 120, 2/1325; № 132, 2/1330) наступныя змяненні і дапаўненні:

1. У частцы 1 артыкула 3.7:

лічбы «11.57, 11.58» замяніць лічбамі «11.57—11.59»;

пасля лічбаў «23.66,» дапоўніць частку лічбамі «23.73,».

2. Частку 1 артыкула 3.13 пасля лічбаў «11.32,» дапоўніць лічбамі «11.59,», пасля лічбаў «23.68» дапоўніць лічбамі «, 23.73».

3. У частцы 1 артыкула 3.21:

лічбы «11.57, 11.58» замяніць лічбамі «11.57—11.59»;

пасля лічбаў «23.16» дапоўніць частку лічбамі «, 23.73».

4. У частцы 1 артыкула 3.30:

у пункце 16:

лічбы «11.57, 11.58» замяніць лічбамі «11.57—11.59»;

пасля лічбаў «23.66,» дапоўніць пункт лічбамі «23.73,»;

пункт 26 пасля лічбаў «11.32,» дапоўніць лічбамі «11.59,», пасля лічбаў «23.68» дапоўніць лічбамі «, 23.73»;

у пункце 59:

лічбы «11.57, 11.58» замяніць лічбамі «11.57—11.59»;

пасля лічбаў «23.16» дапоўніць пункт лічбамі «, 23.73».

Артыкул 4. Гэты Закон уступае ў сілу праз дзесяць дзён пасля яго афіцыйнага апублікавання.

Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь А. ЛУКАШЭНКА

27 чэрвеня 2007 года, г. Мінск.
№ 246 — З

Крымінал, здарэнні

ВІНТОЎКА Ў АЎТО

Супрацоўнікі дарожна-паставой службы ДАІ Мірскага РАУС ля вёскі Туркова затрымалі «Фольксваген-Джэта», якім кіраваў мясцовы жыхар. Ён у салоне іншамаркі вёз вінтоўку «ТОЗ-8М» калібрам 5,6 міліметра і 29 патронаў да яе. Узбуджана крымінальная справа.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

ВАДЗІЦЕЛЬ АДКУПЛЯЎСЯ ХАБАРАМ...

Пракуратурай Бярозаўскага раёна ўзбуджана крымінальная справа ў адносінах да жыхара вёскі Нарутовічы, які спрабаваў даць хабар у памеры 100 тыс. рублёў інспектару ДПС ДАІ Бярозаўскага РАУС. Каля сямі гадзін вечара ў дзяжурную часць райаддзела патэлефанавалі грамадзяне і паведамілі, што вадзіцель бэжавага аўтамабіля ВАЗ-2105 знаходзіцца ў стане алкагольнага ап'янення. Праз 20 мінут згаданае аўто было затрымана, аднак вадзіцель адмовіўся ад праходжання медыцынскага агляду. Пры складанні пратаколу затрыманы прапанаваў інспектару вырашыць пытанне палюбоўна — за хабар. На гэтым і «спаліўся»: праваахоўнік адмовіўся ад грошай, а хабарадаўца затрыманы.

Марыя ЮРКЕВІЧ,
старшы інспектар службы прафілактыкі і прапаганды спецпадраздзялення «Страла».

ЛЯСНЫЯ «ДАРЫ»...

Замест ягад і грыбоў у лесе паблізу ад вёскі Лявонцьевічы Мінскага раёна людзі натыкнуліся на багаты арсенал боепрыпасаў, які захаваўся тут з часоў Вялікай Айчыннай вайны. Група размінірования адной з вайсковых часцей, якая працавала на месцы з выбухованебяспечнымі знаходкамі, налічыла тут 12 гранат Ф-1 з запаламі, 23 артылерыйскія ўзрывальнікі, 15 мінамётных мін , 40—50 мм, 43—45 мм і 17—76 мм артылерыйскіх снарадаў. Усе боепрыпасы былі абясшкоджаны.

Ігар ГРЫШЫН.

Крынічка

«Цякла тут з лесу невялічка
Травой заросшая крынічка».
Якуб КОЛАС.

Рубрыку вядзе Валянціна ШПІЛЕЎСКАЯ, тэл. 285–88–81

№ 21 (239)

Вінаград — не бяроза...



Сёння вінаградары-аматары ў Беларусі не лічаць гэту культуру паўднёвай навінкай. У садах многіх з іх вырошчваецца да 100 і больш гатункаў.

— Цяпер можна з абсалютнай упэўненасцю сказаць, што вінаград перастаў быць культурай выключна паўднёвай. Вінаградную лазу зараз паспяхова культывуюць у Беларусі, Прыбалтыцы, Падмаскоўі, Сібіры, — гаворыць намеснік старшыні клуба «Паўночны вінаград» Зінаіда МАЛАШЭВІЧ.

— Якіх-небудзь 15 гадоў таму тэма вінаграду была рэдкасцю на старонках беларускага друку. Цяпер яна стала вельмі папулярнай. Мы ўлічваем патрабаванні чытачоў розных выданняў, стараемся дапамагчы ім набыць матэрыял, вырашыць пытанні па вырошчванню, таму кожны год праводзім вінаградныя выставы. У 2001 годзе першая выстава мела поспех, але не была настолькі папулярнай. Людзі, якія прыходзілі на яе і бачылі вінаград, у першую чаргу думалі, што ён прывезены з Малдовы, а мы паказваем яго як свой. Яны не верылі, што ён вырас у Беларусі, што гэта наогул магчыма. Тады і было вырашана стварыць клуб вінаградараў. Вядомыя вучоныя чыталі лекцыі па яго вырошчванню, а аматары-вінаградары дзяліліся вопытам. Мы бачылі, што ўсё больш і больш становіцца прыхільнікаў гэтай культуры, і, мяркуючы па колькасці наведвальнікаў, наша штогадовае мерапрыемства карыстаецца папулярнасцю. На вінаграднай выставе можна набыць саджанцы гатунку, які вам спадабаўся, заказаць чаранкі, пакаштаваць ягады і атрымаць характарыстыку гэтага гатунку. У нашых выставах заўсёды ўдзельнічае Інстытут пладаводства, у яго самая вялікая калекцыя, а яго апорны пункт у Пінску пастаўляе кожны раз вялікую колькасць гатункаў вінаграду.

У нашых выставах удзельнічаюць вінаградары з Прыбалтыкі і Украіны. Напрыклад, вінаградары Прыбалтыкі прапануюць свой вінаград з гарантыяй, што дадзены гатунак прыжывецца і будзе пладаносіць, умовы ж надвор'я амаль аднолькавыя. Гатункі з Новачаркаска ў параўнан-ні з літоўскімі больш салодкія, сакавітыя і таксама могуць у нас расці, нашы вінаградары ўжо выпрабавалі іх. Магчыма, яны не дабіраюць цукрыстасці ў нашых умовах і не такія салодкія, але ўсё роўна смачныя.

У гэтым годзе выстава будзе праводзіцца ў некалькіх гарадах. У Брэсце яна пройдзе 2 верасня, у Гродне — 6 і 7 верасня, у Маладзечне — 9 верасня. І, як падагульняючая выстава, 13—14 верасня — ў Мінску, у Палацы культуры ветэранаў, дзе збяруцца вінаградары з усёй Беларусі, прадстаўнікі з Украіны і Прыбалтыкі, якія прыязджаюць да нас пастаянна.

— Ці можна будзе ў гэтым годзе на выставе купіць саджанцы буякоў, як гэта практыкавалася ў іншыя гады?

— На вінаградную выставу мы запрашаем людзей, якія займаюцца развядзеннем рэдкіх для рэспублікі культур, напрыклад, садовых буякоў, брусніц, журавін, або нейкіх дэкаратыўных культур. Людзі, якія вырошчваюць рэдкія кветкі, таксама запрашаюцца паўдзельнічаць у выставе. Хто не змог купіць саджанцы буякоў на Дні буякоў у пачатку жніўня, можа гэта зрабіць на выставе вінаграду. Буякі, па прапанове Р. Лойкі, увайшлі секцыяй у наш клуб. І буячнікі, як члены клуба, павінны ўдзельнічаць у выставе.

— Часта, бываючы ў каго-небудзь на дачы, бачыш кусцік вінаграду, невялікую гронку — гаспадары радуюцца і гэтаму. Што трэба для таго, каб атрымаць крыху больш: любоў да расліны, час, ці яшчэ што?

— Любові адной мала, мала і зацікаўленасці — патрэбныя веды. Вінаград — не бяроза, як часта любіў паўтараць вядомы вучоны-вінаградар Р. Лойка: пасадзіў і будзе расці. Для вінаграду патрэбна асобная тэхналогія. Трэба выкапаць ямку і пакласці такой зямлі, якая падыходзіць для гэтай культуры. Дадаць патрэбныя ўгнаенні. Ведаць, як абразаць, якія падкормкі даваць, як апрацоўваць ад хвароб і шкоднікаў. Аднаму патрэбна абрэзка моцная, а другому — не вельмі; у гэтага гатунку трэба знімаць гронкі да пэўнай колькасці, калі цвітуць ці завязваюцца, а ў гэтага — не, у іншага гатунку на адным парастку пакідаць усяго адну гронку, а не дзве-тры, бо ягады драбнеюць. І вышыня ў кожнага гатунку свая. Калі пакінуць неабрэзаным, то не выспеюць да зімы самі лозы.

— Не ўсякім гатункам вінаграду можна абвіць альтанку?

— Зусім не. Хіба толькі Альфай, якую называюць яшчэ Ізабэлай, або дзікім дзявочым вінаградам. Ну яшчэ Супагай можна было б.

Здымаем памідоры

Пры добрым надвор'і памідоры можна ўбіраць з парнікоў да канца верасня. Важна не ўпусціць тэрмінаў іх канчатковай уборкі. Калі вам удалося зберагчы кусты памідораў ад фітафтарозу, то плады трэба зняць, пакуль тэмпература ўначы не апускаецца ніжэй за 5 градусаў. Калі гэтага не зрабіць, то плады, якія засталіся на кустах, хутка загніваюць. Знятыя са здаровых раслін плады сартуюць: для даспявання і выкарыстання ў свежым выглядзе ці на засолку.

З пладоў з механічнымі пашкоджаннямі і недаспелых можна зварыць таматнае пюрэ. Памідоры, адабраныя для даспявання, пакладзіце на паліцы, падваконні альбо ў скрынкі — не больш чым у 3 рады. Хутчэй за ўсё чырванеюць памідоры пры тэмпературы 20—25 градусаў у памяшканні, якое праветрываецца. Калі вы хочаце паскорыць іх даспяванне, то разам з зялёнымі пладамі пакладзіце некалькі чырвоных. Вы пераканаецеся, што працэс выспявання пойдзе хутчэй. Калі трэба, каб памідоры выспявалі больш марудна, то скрынку трымаюць у памяшканні, дзе тэмпература не вышэй за 15 градусаў, а памідоры, якія пачынаюць чырванець, трэба адбіраць штодзень. Калі памідоры трэба захаваць свежымі на працягу 2—2,5 месяцаў, то з раслін здымаюць з пладаножкамі толькі зялёнымі і абсалютна здаровымі. У скрынку ўкладваюць пладаножкамі ўверх. Скрынкі павінны быць невялікімі, на 5—6 кг. Паміж пладамі і на дно скрынкі насыпаюць дробную драўнінную стружку ці сухі торф каля 1—2 см. Яшчэ лепш выкарыстаць сухі свежы сфагнавы мох. Лепшая тэмпература ў гэтым выпадку — 12 градусаў.

Многія агародніі з надыходам начных пахаладанняў асцярожна выкопваюць з парніка з комам зямлі здаровыя расліны. Памідоркі яшчэ толькі завязаліся ці не поўнасцю сфарміраваліся. Іх падвешваюць каранямі ўверх у сухім падвале пры тэмпературы 10—12 градусаў. Карысна размясціць ком зямлі з каранямі ў поліэтыленавым пакеце, шчыльна абвязаўшы яго вакол сцябла. Усё гэта дазваляе падоўжыць тэрмін выкарыстання свежых памідораў аж да Новага года. Пры гэтым чырванеюць нават плады велічынёй з грэцкі арэх.

Як захаваць ураджай

Сёлета ўраджай парадаваў у агародзе. Морква, бульба, цыбуля, капуста ўрадзілі на славу. Трэба пастарацца захаваць гэтае добро. Таму, не марудзячы, спусціцеся ў свой склеп ці падвал, ачысціце сховішча ад смецця і старых адходаў, замажце ўсе дзіркі і шчыліны. Пакладзіце стэлажы, калі іх не было, адгарадзіце месца для бульбы і асобна для караняплодаў. Потым памяшканне прасушыце і прадэзінфіцыруйце. Для гэтага вазьміце 400 г хлорнай вапны, развядзіце ў 10 л вады і дайце настаяцца 2 гадзіны. Гэтым растворам апырскайце ўсё сховішча. Пасля дэзінфекцыі памяшканне яшчэ раз праветрыце і пабяліце. Для пабелкі вазьміце 1,5—2 кг нягашанай вапны, развядзіце яе ў 10 л вады (вапну папярэдне змяшайце з медным купарвасам у суадносінах 1:1).

Вялікую шкоду ўраджаю наносяць грызуны. Каб пазбавіцца ад іх, прыбярыце вакол склепа ці падвала кучы смецця, а потым прадэзінфіцыруйце гэтыя месцы хлоркай. Калі вы знайшлі пры гэтым норкі, закіньце ў іх бітае шкло ці замажце цэментам.

Цяпер можна закладваць ураджай, маючы на ўвазе наступнае: пры тэмпературы вышэй за 5—6 градусаў агародніна моцна дыхае, а гэта прыводзіць да страты вільгаці; тэмпература ніжэй за нуль градусаў выклікае яе падмарожванне. Значыць, трэба пастаянна сачыць за тэмпературай паветра ў сховішчы.

Пры дыханні гародніны выдзяляецца вуглекіслата, якая пагаршае ўмовы яе захоўвання, таму добра было б абсталяваць сховішча вентыляцыяй. Улічыце таксама, што паветра ў ім не павінна быць занадта вільготным.

Захаванасць агародніны залежыць і ад яе гатункаў. Найбольш прыгодныя для захоўвання такія гатункі, капусты як «амагер», «беларуская». Доўга ляжыць морква «шантанэ», «маскоўская зімняя». Незалежна ад гатунку добра зімуюць буракі і бручка.

Перш чым укладваць караняплоды ў штабелі, насыпце на дно чыстага пяску слоем 2—3 см. Затым пакладзіце слой агародніны, зноў пясок і г.д. Можна перакласці агародніну сухім імхом. Для белакачаннай капусты зрабіце стэлажы, на якія кладзіце качаны ў два-тры слаі, але так, каб паветра пранікала да кожнага. Можна пакласці качаны і ў невялічкія штабелі храпкамі ўверх. Часам іх звязваюць па два і падвешваюць на перакладзінах ці рэйках.

Цыбулю і часнок захоўваюць пасля прасушвання і абрэзкі ў скрынках, кашах ці мяшках. Некаторыя гаспадыні, не абразаючы бацвіння, плятуць косы з цыбулі і ў такім выглядзе падвешваюць яе да столі.

Калі разумна ўсё зрабіць, знойдзецца ў сховішчы месца і для салення, і для варэння.

РУП «БЕЛСПЕЦКОНТРАКТ» РЕАЛИЗУЕТ:

АВТОМОБИЛЬНАЯ ТЕХНИКА

1. А/м УАЗ — 2000000-5000000 руб.
2. А/м ГАЗ — 2350000-2790000 руб.
3. А/м ЗИЛ — 2400000-5000000 руб.
4. А/м «УРАЛ» — 3900000-15000000 руб.
5. А/м КамАЗ — 8600000-18000000 руб.
6. А/м МАЗ — 4360000 руб.
7. Трактор Т-150К — 4000000 руб.
8. Трактор ДТ-75 — 3000000-3400000 руб.
9. Гусеничный тягач АТС-59Г — 25000000-28000000руб.
10. Прицепы и п/прицепы — 2100000-2400000 руб.
11. Кузов-фургоны — 610000-8460000 руб.
12. Автомобильные кабины — 210000-440000 руб.
13. Изношенные покрышки с металлокордом — 42300 руб. за 1 тонну
14. Автошины — 55000-70000 руб.
15. Автомобильные двигатели — 250000-4000000 руб., а также **автозапчасти — всего порядка 50 позиций.**

ИМУЩЕСТВО РАКЕТНО-АРТИЛЛЕРИЙСКОГО УПРАВЛЕНИЯ

1. Обмывочно-нейтрализационная машина 8Т311 — 5500000 руб.
2 Автошасси ЗИЛ-131 — 2500000-3900000 руб.
3. Шасси 1-П-2,5 — 480000 руб.
4. Шасси 2-ПН-2 — 760000 руб.
5. Агрегат бензоэлектрический АБ-4-П/115 — 600000-810000 руб.
6. Электростанция ЭСД-2-12 — 3562000-17100000 руб.
7. Блок питания ТБП-52 — 60000 руб.
8.Трансформатор 220/12В — 5000 руб.
9. Агрегат сварочный АДБ-309 У1 — 600000 руб.
10. Агрегат сварочный АДБ-306 — 750000 руб.
11. Агрегат электросварочный ВД-306 — 120000 руб.
12. Кузовы-фургоны КМ66ДС/К-131 — 420000-950000 руб.
13. Прицеп кабина РД-75 — 3500000 руб.
14. Кунг-1М — 1020000 руб.
15. Кабина аппаратная от изд.9С82 — 271500 руб.
16. Прицеп ПАУ-1 (А,Б,К) — 788100 руб.
17. Горн кузнечный переносной — 150000 руб.
18. Электрозаточной станок ЭЗС-2 — 20000 руб.
19. Настольно-сверлильный станок 2М112 — 150000 руб.
20. Генератор ацетиленовый АСВ-1,25-1 — 17000 руб.
21. Электрозаточной станок ЭТШ-1 — 20000 руб.
22. Генератор ацетиленовый АСП-1,25 — 17000 руб.
23. Насос БКФ-4 — 5000 руб.
24. Мотопомпа МП-800Б — 500000-505000 руб.
25. Устройство зарядноразрядное УЗР-15УЗ — 50000-86000 руб.
26. Баллон емк. 40л — 27000 руб.

ИМУЩЕСТВО ВВС И ВОЙСК ПВО

1. Авиационные двигатели — 8000000-340000000 руб.
2. Парашюты — 51100-1700000 руб.
3. Парашютно-тормозная система — 65000-645000 руб.
4. Парашютно-десантная жидкая тара — 414000 руб.
5. Приборы: линейки поверочные, генераторы, теодолиты, микрометры, нивелиры, контактороы, глубиномеры, реле, осциллографы и многое другое — 1900-4605000 руб.
6. Радиолокационная прицельно-навигационная система КУПОЛ-II-76 — 131897000 руб.
7. А/ш ГАЗ-66 с кунгом К-66Н — 3400000-4000000 руб.
8. А/ш ЗИЛ-131 с «Кунгом-1М» — 3855000-5800000 руб.
9. Изделие АПП-90П — 3000000-5500000 руб.
10. Каток пневмоколесный прицепной ДУ-37В/ДУ-16В — 8500000-31010000 руб.
11. Двигатель ЗИЛ-375 — 3150000 руб.
12. Раздаточная коробка АПА-5Д — 950000 руб.
13. Кислородоазотодобывающая станция АКДС-70М — 187000000 руб.
14. Автомоб. кислороднозарядная станция АКЗС-75,АКЗС-75М— 5520000-32000000 руб.
15. Аэродромный электромоторгенератор АЭМГ-60/30М — 2000000 руб.
16. Аэродромный электромоторгенератор АЭМГ-50М1 —3000000-9530000 руб.
17. Аэродромный кондиционер АК-1,6-9А — 138900000-145800000 руб.
18. Аэродромный многоцелевой кондиционер АМК-3К — 30000000-100100000 руб.
19. Аэродромный многоцелевой кондиционер АМК-24/56 — 14460000-69390000 руб.
20. Резервуар для хран. и трансп. жидкого кислорода ТРЖК-2У — 3000000 руб.
21. Заправщик углекислотный авиационный ЗУА-1000 — 271060000 руб.
22. Газификатор сжиженных газов ГСГ-250/420 — 40760000 руб.
23. Унифицированная газозарядная станция УГЗС.МА — 58455000 руб.
24. Установка для проверки гидросистем УПГ-250 — 18000000 руб.
25. Установка для проверки гидросистем УПГ-300 — 25730000-126040000 руб.
26. Авиационный подвижной электроагрегат АПА-5Д — 42000000-204570000 руб.
27. Аэродромный передвиж. электроагрегат АПА-50М — 7500000 руб.
28. Аэродромный подвижной электроагрегат АПА-80 — 17200000-25800000 руб.
29. Агрегат электропреобразовательный авиационный АЭМГ-50М — 2510000 руб.
30. Электрогидроустановка ЭГУ-17/210 — 11940000-56410000 руб.
31. Электрогидроустановка ЭГУ-50/210-131 — 30140000 руб.
32. Унифицированная компрессорная станция УКС-400В-П4 — 5650000-41625000 руб.
33. Воздухозаправщик ВЗ-20/350 — 11950000 руб.
34. Обмывочно-нейтрализационная машина 8Т-311М — 6900000 руб.
35. Агрегат АБ-2-0/230М-1 — 160000 руб.
36. Агрегат АБ-4-Т/230М-1 — 330000 руб.
37. Агрегат АБ-4-Т/400М-1 — 420000-990000 руб.
38. Электростанция ЭСД 2-12 — 6800000 руб.
39. Электростанция ЭСБ-12ВС/400М1У1 — 1200000-2200000 руб.
40. Электростанция ЭСД-30-ВС/400-М2 — 4520000 руб.
41. Кабель КМБп-4 — 45000 руб.
42. Электр. таль 0,25т — 275000-396000 руб.
43. Подвесной топливный бак — 350000-600000 руб.
44. Костюм ВК-3М — 30200 руб.
45. Втулка несущего винта — 6500000-57650000 руб.
46. Втулка рулевого винта — 36490000-255400000 руб.
47. Автомат перекоса — 5800000-6000000 руб.
48. Промежуточный редуктор — 25000000-27000000 руб.
49. Хвостовой вал — 20000000 руб.
50. Главный редуктор ВР-2 — 17000000-37980000 руб.
51. Редуктор ВР-26 — 14000000 руб.
52. Лопасти несущего винта Ми-2 — 5000000 руб.
53. Комплект элементов металлоконструкций СРМ-10,8хОН — 18500000 руб.
